ДУ “МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ІМЯ А.С. ПУШКІНА”

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ВЕСНІК

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЗБОРНІК

## ВЫПУСК 1/2021

МІНСК
2021

УДК 02
ББК 78.3(4Беі)

Бібліятэчны веснік : інфармацыйны зборнік / ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”, аддзел бібліятэказнаўства ; [склад.: І.П. Лазарава]. – Мінск, 2021. – Вып. 1/2021. – 57 с.

# ЗМЕСТ

**Жыццё бібліятэк: панарама падзей............................4**

Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы ......................... 4

Масавыя мерапрыемствы ...................................................... 13

**Бібліятэка і час...........................................................28**

Кніжная інклюзія ......... **Ошибка! Закладка не определена.**8

Пазнаць тую зямлю, на якой жывеш .......................................... 35

Волшебство книжного лета..................................................... 40

"Голасам свайго пакалення" ................................................... 46

"Беларусам я завуся, родным краем ганаруся" ...................... 53

# Жыццё бібліятэк: панарама падзей

## Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы

### ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

Абласны семінар для загадчыкаў дзіцячых бібліятэк і аддзелаў абслугоўвання дзіцячага чытача бібліятэк Мінскай вобласці “Роля бібліятэкі ў рэалізацыі інфармацыйных і культурна-забаўляльных патрэбаў непаўналетніх” (на базе ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”, май, 2021 г.)

Вебінар “Виртуальное представительство библиотек: идеи для размышления” (арганізатары: ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна” і ФДБАУ “Кемераўскі дзяржаўны інстытут культуры”, сакавік, 2021 г.)

Міжнародны навукова-практычны семінар “Удивительное краеведение” (арганізатары: ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”, ФДБАУ ВА “Чалябінскі дзяржаўны інстытут культуры”, МБУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Златавустаўскай гарадской акругі”, красавік, 2021 г.)

### ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева”

Раённы семінар “Публічныя бібліятэкі Барысаўскага раёна ў Год народнага адзінства: прыярытэтныя накірункі работы” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, люты, 2021 г.)

Анлайн-сустрэча “Культура малой радзімы” ў рамках міжнароднага сацыякультурнага праекта “Адкрыты дыялог культур” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, люты, 2021 г.)

Рэспубліканскі семінар “Стварэнне даступнага асяроддзя для ўсіх катэгорый карыстальнікаў: прастора,

калекцыі, праграмы” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, красавік, 2021 г.)

Анлайн-сустрэча “Стратэгія развіцця бібліятэк на сучасным этапе” ў рамках міжнароднага праекта “Бібліятэка без межаў: інтэграцыя ў сусветную бібліятэчную прастору” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, красавік, 2021 г.)

Анлайн-сустрэча “Пісьменнік у прасторы культуры” ў рамках міжнароднага сацыякультурнага праекта “Адкрыты дыялог культур” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, красавік, 2021 г.)

Раённы семінар “Асноўныя аспекты дзейнасці бібліятэк Барысаўскага раёна ў летні перыяд 2021 года: ідэі, падыходы, рашэнні” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, май, 2021 г.)

**ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”**

Семінар “Сельская библиотека сегодня: поиск собственного имиджа” (на базе Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, красавік, 2021 г.)

**ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”**

Семінар “Сучасны змест і актуальныя формы краязнаўчай дзейнасці ў сельскай бібліятэцы” (на базе Любанскай сельскай бібліятэкі і Чурлёнскай сельскай інтэграванай бібліятэкі, май, 2021 г.)

**ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**

Вытворчая нарада бібліятэчных работнікаў (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, люты, 2021 г.)

Творчая лабараторыя “Бібліятэка для маладых: сучасная, цікавая, неабходная” (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, сакавік, 2021 г.)

Семінар “Бібліятэка і сям’я: вопыт, ідэі, творчасць” (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, красавік, 2021 г.)

Прафесійны дыялог “И пусть поколения знают!”: грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення і моладзі ва ўмовах бібліятэкі (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, май, 2021 г.)

**ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”**

Круглы стол “Бібліятэка 2021 – арыентыр на будучае” (на базе ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”, люты, 2021 г.)

Круглы стол – дыялогавая пляцоўка “Сила государства в единстве народа”: “Мы один народ – у нас одна страна” – сустрэча з дэлегатам VI Усебеларускага народнага сходу (на базе ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”, сакавік, 2021 г.)

Круглы стол “Месца бібліятэкі ў выхаванні адносін да здаровага ладу жыцця” (на базе ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”, красавік, 2021 г.)

Круглы стол “Сучасныя формы арганізацыі занятасці непаўналетніх у бібліятэках у час летніх канікул” (на базе ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”, май, 2021 г.)

**ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”**

Семінар “Сельская бібліятэка як цэнтр вольнага часу, зносін і развіцця творчых здольнасцей наведвальнікаў” (на базе Нагорнаўскай сельскай бібліятэкі, сакавік, 2021 г.)

Пасяджэнне савета пры дырэктары “Деятельность Заостровечской сельской библиотеки по организации библиотечно-информационного обслуживания несовершеннолетних пользователей” (сакавік, 2021 г.)

Круглы стол “Досуг с пользой: проблемы и опыт привлечения детей и подростков в библиотеки” (на базе ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”, красавік, 2021 г.)

Семінар “Сучасная бібліятэка і сучасны бібліятэкар: стыль, імідж, рэклама” (на базе Тучанскай сельскай бібліятэкі, чэрвень, 2021 г.)

Практыкум “Рэсурсы і магчымасці ПЦПІ” (на базе ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”, чэрвень, 2021 г.)

Пасяджэнне савета пры дырэктары “Фарміраванне бібліятэчна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай культуры ў бібліятэках Кухчыцкага сельскага савета” (чэрвень, 2021 г.)

**ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”**

Дзень інфармацыі “Арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне дзейнасці ўстаноў культуры комплекснага тыпу” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”, люты, 2021 г.)

Круглы стол “Падлетак і бібліятэка: прафілактыка безнагляднасці і правапарушэнняў сярод дзяцей і падлеткаў” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”, сакавік, 2021 г.)

Семінар “Роля бібліятэк у прафілактыцы асацыяльных праблем сярод моладзі. Прапаганда здаровага ладу жыцця” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”, май, 2021 г.)

Прафесійны дыялог “У пошуках ідэй: як дапамагчы бібліятэцы стаць прывабнай” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”, чэрвень, 2021 г.)

**ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка”**

Семінар “Павышэнне дзейнасці публічных бібліятэк па арганізацыі вольнага часу непаўналетніх” (на базе ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка”, красавік, 2021 г.)

Дзень прафесійнай інфармацыі “Продвижение чтения: сохраняем традиции, ищем новое” (на базе ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка”, май 2021 г.)

**ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”**

Круглы стол “Падвядзенне вынікаў работы за 2020 год” (на базе Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, люты, 2021 г.)

Анлайн-нарада “Библиотеки как ресурс развития территории” (на базе ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”, красавік, 2021 г.)

Анлайн-нарада “Читательские объединения в библиотеке: новые времена, новые взгляды” (на базе ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”, май, 2021 г.)

Нарада “Деятельность библиотек в летний период. Организация работы любительских объединений” (на базе ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”, чэрвень, 2021 г.)

Анлайн-нарада “Современная библиотека: как можно эффективно работать онлайн” (на базе ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”, ліпень, 2021 г.)

**ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”**

Медыякансультацыя “Інавацыі бібліяграфічнай работы” (на базе ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”, люты, 2021г.)

Семінар “Фарміраванне здаровага ладу жыцця ў непаўналетніх” (на базе ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”, красавік, 2021г.)

**ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”**

Анлайн-семінар “Продвижение библиотек в социальных сетях” (на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”, студзень, 2021 г.)

Анлайн-семінар “Итоги года: реализация библиотечных проектов” (на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”, люты, 2021 г.)

Анлайн-семінар “Законодательство, регулирующее вопросы ответственности родителей за воспитание детей и создание для них безопасных условий” (на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”, люты, 2021 г.)

Анлайн-семінар “Чтение, книга, библиотека – основы жизненной стратегии подрастающего поколения” (на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”, сакавік, 2021 г.)

**ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”**

Метадычны дзень “Дзейнасць бібліятэк раёна – ад рэалізацыі плана да новых ідэй” (на базе ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”, студзень, 2021 г.)

Семінар “Арганізацыя работы бібліятэкі з непаўналетнімі ў летні перыяд” з удзелам супрацоўніка РАУС (на базе ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”, май, 2021)

**ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”**

Семінар “Бібліятэчнае абслугоўванне чытачоў і вядзенне ўліковай дакументацыі” (на базе ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”, сакавік, 2021г.)

Семінар “Традыцыі і інавацыі ў арганізацыі сямейнага вольнага часу. Работа ўстаноў культуры з сям’ёй” (на базе ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”, май, 2021 г.)

Семінар “Удасканаленне мадэлі аказання дапамогі сельскім бібліятэкам і ажыццяўленне кантролю за іх дзейнасцю” (на базе ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”, май, 2021 г.)

**ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”**

Нарада бібліятэчных работнікаў, дзе разглядаліся пытанні: “Вакцынацыя ад COVID-19”, “Змяненні ў аплаце працы работнікаў бюджэтнай сферы з 1 ліпеня 2021 г.” (на базе ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”, чэрвень, 2021 г.)

**ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”**

Майстар-клас “Работа з кнігай сучаснага беларускага аўтара” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, люты, 2021 г.)

Савет пры дырэктары “Сацыяльна-культурная дзейнасць Вескай сельскай бібліятэкі-клуба” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, красавік, 2021г.)

Семінар “Бібліятэкі і сям’я: інавацыйныя формы і метады работы” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, красавік, 2021 г.)

**ДУК “Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”**

Нарада “Падвядзенне вынікаў работы за 2020 г.” (на базе ДУК “Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”, люты, 2021 г.)

Праблемны семінар з удзелам начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх Д. П. Белага “Падлетак і бібліятэка”

(на базе ДУК "Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча", сакавік, 2021 г.)

Метадычны дзень "Новая літаратура для дзяцей і дарослых" (на базе ДУК "Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча", красавік, 2021 г.)

Семінар "Летняе чытанне з захапленнем" (на базе Усяжскай сельскай бібліятэкі, май, 2021 г.)

Дзень спецыяліста "Традыцыйныя і новыя формы работы бібліятэкі" (у рамках заняткаў школы пачынаючага бібліятэкара на базе ДУК "Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча", чэрвень, 2021 г.)

**ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка"**

Нарада "Итоги работы ГУК "Стародорожская РЦБ" в 2020 году: современное состояние и перспективы на будущее" (на базе ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка", студзень, 2021 г.)

Метадычны дзень "Информационные технологии в библиотеке" (на базе ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка", сакавік, 2021 г.)

Семінар-практыкум "Роль библиотеки в системе патриотического воспитания читателей" (на базе Паставіцкай сельскай бібліятэкі, красавік, 2021 г.)

Метадычны дзень "Профессиональная ориентация молодежи в условиях публичных библиотек" (на базе ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка", май, 2021 г.)

Семінар-практыкум "Детская библиотека как центр информационных, культурных и социокультурных коммуникаций" (на базе Старадарожскай дзіцячай бібліятэкі, чэрвень, 2021 г.)

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

Семінар “Бібліятэка – дзецям: арганізацыя вольнага часу дзяцей і падлеткаў” (на базе дзіцячай бібліятэкі імя Якуба Коласа, сакавік, 2021 г.)

Круглы стол “Арганізацыя работы з састарэлымі карыстальнікамі і карыстальнікамі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, якія маюць патрэбу ў бібліятэчным абслугоўванні” (на базе ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”, чэрвень, 2021 г.)

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”

Кансультацыя-практыкум “Формы і метады работы па далучэнні дзяцей і падлеткаў да чытання” (на базе ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”, люты, 2021 г.)

Кансультацыя-практыкум “Выставачная дзейнасць у бібіятэцы. Методыка падрыхтоўкі і афармлення кніжных выстаў” (на базе ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”, красавік, 2021 г.)

Кансультацыя-практыкум “Расстаноўка картак у каталогі” (на базе ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”, чэрвень, 2021 г.)

## ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”

Рабочая сустрэча ў рамках рэалізацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Жодзінскім гарвыканкамам і Смалявіцкім благачыннем Беларускай Праваслаўнай Царквы ў 2021г. (на базе ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г.Жодзіна”, люты, 2021 г.)

**ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”**

Семінар-практыкум “Арганізацыя работы сельскай бібліятэкі” (на базе Кліноцкай сельскай бібліятэкі, май, 2021 г.)

Нарада “Народныя казкі – найбагацейшы скарб: казка ў выхаванні дзяцей” (на базе ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”, чэрвень, 2021 г.)

## Масавыя мерапрыемствы

**ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”**

19 красавіка ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна адбылася сустрэча з беларускай пісьменніцай Надзеяй Ясмінскай, аўтарам фантастычных і казачных кніг для дзяцей і падлеткаў, якая прэзентавала сваю кнігу “Чароўныя ніткі пані Яніны”.

5 мая ў актавай зале Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна сумесна з валанцёрам Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Першамайскага раёна Аленай Шчарбак быў арганізаваны дабрачынны канцэрт “Сквозь года звенит Победа”, прымеркаваны да Дня Перамогі.

15 мая ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбыўся творчы вечар Артура Федаровіча – выканаўцы аўтарскай песні, акцёра тэатра і кіно.

**ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева”**

У студзені-лютым у цэнтральнай бібліятэцы праводзіўся міжнародны конкурс дзіцячага малюнка “Мы малюем горад-пабрацім”, прымеркаваны да рэспубліканскай акцыі “Барысаў – культурная сталіца Беларусі 2021 года”.

У лютым у цэнтральнай бібліятэцы адбылася прэзентацыя сумеснай літаратурнай праграмы “Сугучча

радкоў” члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Яны Явіч і члена Міжнароднага саюза пісьменнікаў “Новы сучаснік” Зміцера Юртаева.

У лютым ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева” прыняла ўдзел у XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, на якой прэзентавала ўласную калекцыю кніг з экслібрысамі з Фонду рэдкіх і каштоўных выданняў і праект “Літаратурная калекцыя”.

У сакавіку ў цэнтральнай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з паэтам, членам Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Беларусі Аляксандрам Быкавым “Буслінае неба Аляксандра Быкава”.

У сакавіку ў рамках адкрыцця Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў цэнтральнай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з пісьменніцай, лаўрэатам Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры, членам Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы і Саюза курскіх літаратараў, арганізатарам і кіраўніком абласнога народнага клуба “Жывіца” Ірынай Карнаухавай “Кніжная дзяржава”.

**ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”**

У сакавіку ў рамках акцыі «Дружим с законом!» у ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” прайшла гутарка «Закон обо мне, мне о законе». Гутарка праводзілася з вучнямі 9 класа ДУА “Гімназія №1 г. Валожына”.

У сакавіку ў Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сумесна з Валожынскай першаснай арганізацыяй «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам» прайшло мерапрыемства, прымеркаванае да Міжнароднага жаночага дня «Самым прекрасным и любимым посвящается».

24 сакавіка ў Валожынскай дзіцячай бібліятэцы ў рамках міжведамаснай прафілактычнай акцыі «Дружим с

законом!» прайшоў круглы стол «По ступенькам права» сумесна з начальнікам ІСН Валожынскага РАУС А.Чаховічам.

У красавіку бібліятэкарамі Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў ДУА “Валожынскі сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй” была праведзена экалагічная гадзіна «Черный след радиации», прысвечаная Міжнароднаму дню памяці аб чарнобыльскай катастрофе.

У красавіку ў Валожынскай дзіцячай бібліятэцы прайшла творчая сустрэча з паэткай Інай Фраловай і пісьменнікам Сяргеем Трахімёнкам.

## ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”

У ліпені ў Бібліятэцы сямейнага чытання прайшла забаўляльна-гульнёвая праграма «Лето, книга, я!» для дзяцей профільнага аздараўленчага лагера для школьнікаў, удзельнікаў і пераможцаў абласных і рэспубліканскіх алімпіяд па рускай і беларускай мовах «ЛингвоГрад», якія створаны на базе Вілейскага дзяржаўнага каледжа.

У чэрвені аддзел па рабоце з дзецьмі раённай бібліятэкі даў старт спартыўна-забаўляльнай праграме для ўдзельнікаў аздараўленчых школьных лагераў горада і раёна «Старт в лето с библиотекой», якая на працягу месяца праходзіла ў гарадскім парку.

У маі да Дня Вялікай Перамогі перад будынкам Вілейскай раённай бібліятэкі дзейнічаў літаратурны бульвар «Спасибо за победный май!».

У сакавіку ў Бібліятэцы сямейнага чытання адбыўся арт-альянс майстра фотаздымкаў Міхася Куляша і паэта-вілейчаніна Уладзіміра Цануніна «У аб’ектыве родныя мясціны».

## ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

У сакавіку ў ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння пашпартоў маладым грамадзянам Рэспублікі Беларусь у рамках Усебеларускай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі».

У красавіку ў ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшоў адкрыты дыялог пакаленняў «Мы будзем вечна помніць подзвіг герояў-землякоў» з удзелам старшыні раённага Савета ветэранаў і падпалкоўніка ў адстаўцы, удзельніка народнага літаратурнага клуба «Выток».

У маі ў ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» быў праведзены дзень Ч «Чытанне сямейнага маштабу».

У чэрвені ў рамках абласнога творчага марафона «ART-MIX» ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістема» запрасіла гараджан і гасцей горада на пляцоўку «Бібліятэка – Тэрыторыя ТЧК: Творчасці. Чытання. Крэатыву».

У чэрвені ў ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістема» адбылася творчая сустрэча паэтаў і пісьменнікаў Дзяржыншчыны і Узденшчыны «Адзінства сэрцаў і радкоў».

## ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”

У лютым праведзены анлайн-чэлендж-марафон “Я чытаю і размаўляю на беларускай мове” да Дня роднай мовы.

У красавіку ў ДУ “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі” была праведзена сустрэча з псіхолагам Капыльскай ЦРБ Стасевіч А.М. і памочнікам лекара Капыльскай ЦРБ Матусевічам В.У., праведзена гутарка-дыялог з удзелам участковага інспектара Капыльскага РАУС

Лазюка В. «Скажем «нет» домашнему насилию!», а таксама сустрэча з удзельнікам конкурсу народных рамёстваў "Жывуць рамёствы, квітнее зямля", народным умельцам разьбы па дрэву Шэлестам В.М.

У чэрвені адбылося пасяджэнне клуба «Нить Ариадны», які працуе пры Капыльскай дзіцячай бібліятэцы, праведзены літаратурны ранішнік «В стране счастливого детства» з удзелам дзяцей летніх пляцовак школ горада.

З 1 сакавіка па 30 чэрвеня 2021 года праходзіў раённы анлайн-конкурс творчых работ "Звонкае слова паэта натхняе", прымеркаваны да 110-годдзя паэта-земляка А. Астрэйкі. Работы пераможцаў будуць выстаўлены, і ўзнагароджанне адбудзецца 5 верасня 2021 года ў Дзень беларускага пісьменства ў г. Капылі.

**ДУ "Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка"**

У красавіку прайшло пасяджэнне клуба "Ровесник", які дзейнічае пры Цэнтральнай раённай бібліятэцы "Профессия для достойного завтра" з удзелам ваеннага камісара Клецкага раёна У. Ермашэвіча і начальніка групы прызыва В. Новіка.

У чэрвені ў Ардзянскай сельскай бібліятэцы-клубе адбылася сустрэча са старшым участковым інспектарам Клецкага РАУС Канановічам А.У. на тэму «Ты должен об этом знать».

У чэрвені Клецкай раённай цэнтральнай бібліятэкай праведзена свята вуліцы Ф.Скарыны "Майго сэрца малая радзіма".

У чэрвені агітальтанка "За здаровае пакаленне", якая была прымеркавана да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй, сабрала ў Заастравецкай сельскай бібліятэцы-філіяле прыхільнікаў здаровага ладу жыцця. Каб сустрэча была цікавейшай і больш запамінальнай, на мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі сілавых структур: часова выконваючы абавязкі начальніка АДАІ старшы дзяржаўтаінспектар

Клецкага РАУС маёр міліцыі Апанасевіч У.І. і старшы інспектар ДПС маёр міліцыі Адамовіч І.С.

**ДУ “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы”**

У сакавіку ў Крупскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы да Дня праваслаўнай кнігі адбылася сустрэча на тэму “Мэты жыцця чалавека. Асвета верай” з удзелам настаяцеля царквы Мікалая Цудатворцы г. Крупкі Мікалая Гміра.

У маі Крупская дзіцячая бібліятэка, Крупская РБ сумесна з Крупскім РЦК правялі свята “Сям’я – гэта святое слова”.

У лютым бібліятэкарамі Крупскай дзіцячай бібліятэкі быў праведзены прафілактычны час “Каб у хату не прыйшла бяда, будзь асцярожны з агнём” з удзелам інспектара Крупскага РАНС.

У красавіку ў рамках творчага раённага марафона “ART – mix” Крупская раённая бібліятэка на плошчы горада правяла цыкл мерапрыемстваў: прэзентацыю кніжнай выставы “Крупшчына літаратурная”, прэзентацыю выставы падзелак з джута і мешкавіны бібліятэкара Крупскай дзіцячай бібліятэкі Смірнягінай Т.М. “Майстэрства рук і сэрца”, краязнаўчую віктарыну па творах пісьменнікаў-землякоў “Пра тых, хто родны край праславіў” і інш.

**ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка”**

У маі ў Лагойскай раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылася сустрэча з прадстаўніком праваслаўнай царквы, айцом Аляксандрам Тарасевічам на тэму “Фарміраванне культуры сямейных адносін на аснове праваслаўнай культуры”.

Да Дня абароны дзяцей бібліятэкар Гасцілавіцкай сельскай бібліятэкі сумесна з Гасцілавіцкім СДК і Гасцілавіцкай СШ арганізавалі тэатралізаванае прадстаўленне “Планета дзяцінства пад сузор’ем дабрыні”.

У чэрвені, да Міжнароднага дня барацьбы са злоўжываннем наркатычных сродкаў і іх незаконным абаротам, у Гайненскай бібліятэцы-клубе ладзілася сустрэча з фельчарам Гайненскага ФАПа Даніловіч П.І. на тэму “Свет супраць наркотыкаў”.

**ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”**

У лютым на базе Любанскай дзіцячай школы мастацтваў традыцыйна прайшоў сёмы раённы конкурс-віктарына «Размаўляем па-беларуску» да Міжнароднага дня роднай мовы.

У сакавіку на базе Любанскай дзіцячай бібліятэкі прайшло адкрыццё цэнтра па духоўна-маральнаму выхаванню дзяцей і падлеткаў “Через книгу – к миру и согласию”.

У маі на базе Любанскай РЦБ прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй “Всей семьёй – в библиотеку!”, былі падведзены вынікі раённага анлайн-конкурсу фотаздымкаў #ЧитайФест.

У маі ў рамках праекта “Жывая кніга” прайшла сустрэча з беларускай пісьменніцай Надзеяй Ясмінскай.

У чэрвені адбылося свята дзяцінства “Счастье, солнце, дружба – вот что детям нужно!”. Падчас свята ў чытальнай зале Любанскай РЦБ прайшла дыскусійная пляцоўка “Молодая семья – кристалл общества”.

У чэрвені прайшло раённае свята паэзіі і песні “Я словам слаўлю родны край”, прысвечанае пісьменніку-земляку І.А. Муравейку. Напярэдадні свята прайшоў раённы анлайн конкурс-чэлендж чытальнікаў “Сцежкамі Івана Муравейкі”.

**ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”**

У маі бібліятэкарамі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” была праведзена навукова-краязнаўчая канферэнцыя “Сейбіт праўды

і веры”, прысвечаная памяці беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, выдаўца, публіцыста Аляксандра Уласава.

У маі ў музейным комплексе “Фальварак Ракуцёўшчына” прайшоў дзень памяці Максіма Багдановіча “І зноў пабачыў я сялібы”, арганізаваны бібліятэкарамі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”.

У чэрвені, падчас Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі “Маладзечна–2021”, ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” арганізавала паэтычную пляцоўку “Роднай зямлі многагалоссе”.

У чэрвені бібліятэкай сямейнага чытання “Верасок” ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” да Міжнароднага дня абароны дзяцей быў арганізаваны фестываль дзіцячага чытання “Весь мир от А до Я откроет книжная страна”.

## ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”

У маі ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” сумесна з Міханавіцкім сельскім саветам, ДУА «Міханавіцкая СШ», філіялам “Міханавіцкі ЦК”, вайсковай часткай 06752 і філіялам «Мінскае УМГ ААТ «Газпром трансгаз Беларусь» арганізавалі аўтапрабег «За Победу, за мир, за независимость» да святкавання 76-ай гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне па памятных месцах Міханавіцкага сельскага савета. У рамках аўтапрабегу прайшлі мітынгі каля ваенных помнікаў, круглы стол і высадка Алеі памяці.

У красавіку Ждановіцкай СБ была праведзена сустрэча з кіраўніком аддзялення грамадскага здароўя Мінскага зонавага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Мітрайкінай Ю. В. “Привычки и здоровье”.

У маі бібліятэкарам Лескаўскай СБ была арганізавана духоўна-асветніцкая гадзіна з настаяцелем храма Архангела Міхаіла айцом Сергіем «Велікодная радасць».

**ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”**

У чэрвені ў Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Танка адбылася прэзентацыя выставы вырабаў з фарфору “Хрупкий мир красоты” мясцовага калекцыянера У. Майсяёнка.

У чэрвені ў Нарацкай пасялковай бібліятэцы для ўдзельнікаў школьнага лагера “Вясёлка” быў распрацаваны партызанскі квэст “Пусть не будет войны никогда”, прымеркаваны да 80-годдзя з пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

У ліпені ў рамках рэспубліканскай акцыі “Чытаем Купалу разам” Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка сумесна з раённым цэнтрам культуры правялі літаратурна-музычную кампазіцыю “Пакуль ёсць Купала, будзе народ”.

**ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”**

У сакавіку ў рамках праекта “Лёсам з Нясвіжчынай” адбылося партрэтнае інтэрв’ю “Лёс чалавека” з настаяцелем прыхода храма Святой Троіцы, лаўрэатам прэміі “За духоўнае адраджэнне” Алегам Абрамовічам.

У красавіку адбыўся V фестываль паэзіі імя П. Пранузы “Голасам свайго пакалення”.

У красавіку адбылася дыялогавая пляцоўка “Чарнобыль: трагедыя, подзвіг, папярэджанне”, у якой прынялі ўдзел ліквідатары наступстваў катастрофы на ЧАЭС.

У маі адбыўся III форум кнігі “Акрылёныя чытаннем” з удзелам выдавецтва “Звязда” і пісьменнікамі Інай Фраловай, Аленай Свечнікавай і Леанідам Дранько-Майсюком.

У маі прайшоў адкрыты дыялог “Беларусь: Учора. Сёння. Заўтра” да Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь сумесна з БРСМ.

У ліпені ў рамках літаратурна-музычнага аб’яднання “Валошкі” адбылася гадзіна памяці “Пяром і сэрцам з Нясвіжам”.

**ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”**

У лютым Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала творчую сустрэчу з беларускім пісьменнікам Л. Дранько-Майсюком “Любовь к Беларуси начинается с детства”, на якой прысутнічалі прадстаўнікі “Выдавецкага дома “Звязда” і супрацоўнікі магазіна “Акадэмкніга” г. Мінска.

У красавіку Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала бібліякіназал “Смотрим фильм – читаем книгу”.

У чэрвені Мар’інагорская гарадская бібліятэка арганізавала летні інтэлектуальны забег “Бегущая книга” пад дэвізам “Я люблю Беларусь”.

У чэрвені Пухавіцкая раённая дзіцячая бібліятэка правяла патрыятычную акцыю “Мы помнім” у памяць аб патрыётах антыфашысцкага супраціўлення, якое дзейнічала ў раёне з 1941 года.

**ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”**

У сакавіку да Дня паэзіі ў Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэцы з дапамогай платформы ZOOM адбылася анлайн-сустрэча «Зямля бацькоў – мая зямля» навучэнцаў ДУА «Гімназія №2 г. Салігорска» і ДУА «Хорастаўская сярэдняя школа Салігорскага раёна» з паэтам і празаікам Хведарам Гурыновічам, членам Саюза

пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Я. Маўра, Ганаровым грамадзянінам Салігорскага раёна.

У красавіку ў ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» сумесна з прадстаўнікамі Мінскага аддзялення Беларускага літратурнага саюза «Полоцкая ветвь» прайшла прэзентацыя новай кнігі В. Акулёнак «Подарите меня рассвету», таленавітай салігорскай паэткі, члена Беллітсаюза «Полоцкая ветвь», кіраўніка літаратурнага клуба «Акцэнт» раённай цэнтральнай бібліятэкі.

У маі ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» сумесна з вучнямі ДУА «Гімназія №2 г. Салігорска» і ДУА «Хорастаўская сярэдняя школа Салігорскага раёна» правялі патрыятычную сацыял-эстафету «И опять зацветает сирень 45-го года…». Салігоршчына ганарыцца сваім легендарным земляком, Героем Савецкага Саюза, В.З. Каржом. З мэтай ушанавання памяці аб славутым земляку «Коржовая сирень» была пасаджана на тэрыторыі каля будынка гімназіі №2 г. Салігорска і каля помніка В.З. Каржу ў аграгарадку Хорастава Салігорскага раёна.

У маі ў Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэцы пачала работу фотавыстава «Гармония неба, земли, человека – Прекрасный Китай», якая была арганізавана сумесна з Міністэрствам культуры і турызму Кітая, Пасольствам Кітайскай Народной Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Кітайскім Культурным Цэнтрам у Мінску. На адкрыцці фотавыставы прысутнічаў саветнік па культуры Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь і дырэктар Кітайскага культурнага цэнтра ў Мінску Чжан Хунвэй.

У чэрвені ў Салігорскай раённай дзіцячай бібліятэцы адбылося свята «Дзяцінства яркая планета», прысвечанае Міжнароднаму дню аховы дзяцей і 55-годдзю з дня заснавання дзіцячай бібліятэкі.

У чэрвені супрацоўнікі Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі ў Парку Чатырох стыхій арганізавалі інтэрактыўную пляцоўку «Библиотека + молодежь = отличный результат», прысвечаную Дню моладзі.

**ДУК “Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”**

У чэрвені ў Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Багдановіча з удзелам мясцовага паэта А. Марозава адбылася краязнаўчая гадзіна “Знакамітыя людзі Смалявіцкага раёна”.

У маі Зеленаборская сельская бібліятэка сумесна з Зеленаборскім СДК правялі літаратурна-краязнаўчы квілт “Мой родны край, цябе я ўсхваляю”.

У красавіку Пекалінская сельская бібліятэка сумесна з ДУА “Пекалінская базавая школа” і заслужаным архітэктарам Беларусі В.М. Малышавым правялі сустрэчу з цікавым суразмоўцам “Яго вялікі талент”.

У лютым Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча сумесна з ДУА “Смалявіцкая раённая гімназія” правялі гадзіну памяці “Салдат вайны не выбірае”.

**ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”**

У лютым дзіцячая бібліятэка ў рамках Тыдня бяспекі правяла гадзіну пажарнай бяспекі «Что запомнить мы должны? Спички детям не нужны» з удзелам інспектара Каваленя С.І.

6 сакавіка 2021 года Сінягоўская сельская бібліятэка сумесна з Сінягоўскім сельскім клубам правялі акцыю «С Международным женским днём мы поздравляем Вас» і павіншавалі на даму ветэранаў працы.

У чэрвені бібліятэкарамі цэнтральнай бібліятэкі з мэтай папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі на сцэне Дзіцячай школы мастацтваў для чытачоў была арганізавана інфармацыйная

гадзіна «Государственные символы – национальная гордость». У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні школы мастацтваў.

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

У лютым, напярэдадні святкавання Міжнароднага дня роднай мовы, у ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка” адбылося мерапрыемства “Родная мова – цудоўная мова”.

У красавіку ў Стаўбцоўскай дзіцячай бібліятэцы імя Якуба Коласа адбылася творчая сустрэча з дзіцячай пісьменніцай Святланай Быкавай “Дорога к себе”.

У маі ў Старасвержанскай сельскай бібліятэцы адбыўся бібліятэчны флэшмоб “Курыць не модна – дыхай свабодна”.

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”

У красавіку ў ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса” адбылася краязнаўчая канферэнцыя “Тут Радзімы маёй пачатак”, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння даследчыка Уздзеншчыны, краязнаўца У.М.Кісялёва.

У красавіку ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі прайшло літаратурнае знаёмства чытачоў Уздзенскай раённай дзіцячай бібліятэкі з карэспандэнтам раённай газеты “Чырвоная зорка”, пісьменніцай, актыўнай творчай асобай Верай Лукашэвіч “Строчки с газетной страницы”.

У маі, да Дня Перамогі, бібліятэкарамі Уздзенскай цэнтральнай бібліятэкі для навучэнцаў УА “Уздзенскі дзяржаўны сельскагаспадарчы ліцэй” быў праведзены ўрок мужнасці “Этих дней не смолкнет слава” з удзелам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі В. М. Шытыкі і малалетняга вязня І. Я. Любчанкі.

У маі ў ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса” прайшоў вечар памяці протаіерэя Міхаіла Навіцкага “Вера как подвиг” з удзелам настаяцеля храма Пятра і Паўла протаіерэя Грыгорыя Чарапеннікава.

У чэрвені ў рамках раённага свята, прысвечанага Дню абароны дзяцей, бібліятэкарамі Уздзенскай раённай дзіцячай бібліятэкі была падрыхтавана і праведзена святочная праграма “Счастье, солнце, дружба – вот, что детям нужно!”.

**ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”**

У лютым бібліятэкарамі Чэрвеньскай цэнтральнай бібліятэкі праведзена сустрэча “Мае правы і мае абавязкі” з удзелам загадчыка юрыдычнай кансультацыі Чэрвеньскага раёна Ладуцька В.І.

У маі бібліятэкары Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавалі паэтычны марафон “Спасибо деду за Победу”.

У маі бібліятэкары Смілавіцкай гарпасялковай бібліятэкі арганізавалі персанальную выставу карцін Насты Гурскай – выпускніцы АРТ-цэнтра “Вулей”.

У чэрвені бібліятэкары Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавалі гульнёвую праграму “Семья, солнце, дружба – вот, что детям нужно” (да Дня абароны дзяцей).

**ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”**

У лютым, да Міжнароднага дня роднай мовы, у цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшло літаратурна-музычнае падарожжа «Спавядальнае слова пра родную мову». На сустрэчу былі запрошаны член Мінскага абласнога народнага клуба паэтаў і кампазітараў «Жывіца» і Беларускага літаратурнага саюза «Полацкая ветка» Зінаіда Багамолава, члены літаратурнага народнага аматарскага калектыву «Натхненне» Лідзія Навумава і Ірына Хілюціч.

У сакавіку ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшла сустрэча з беларускай пісьменніцай, старшынёй Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Святланай Быкавай.

У красавіку ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі прайшла прэзентацыя кнігі аўтара Таццяны Каленік “Бабуліны шпулькі”.

У красавіку ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы была арганізавана дыялогавая пляцоўка «Памяць сэрца», прысвечаная Міжнароднаму дню вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. У адкрытым дыялогу выступілі гісторыкі, бібліятэкары, педагогі, прадстаўнікі сацыяльнай службы горада, грамадскіх аб'яднанняў. На сустрэчы прысутнічалі навучэнцы Жодзінскага прафліцэя. Успамінамі падзяліліся ветэраны В.І. Бяззубаў, К.К. Калько, В.Н. Карпіевіч.

У красавіку ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшла сустрэча з галоўным рэдактарам часопіса “Вожык” Юліяй Зарэцкай і карыкатурыстам Аляксандрам Каршакевічам.

У маі ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы адбылася вечарына ўспамінаў «Сирень Победы», у якой прынялі ўдзел ветэраны Ф.І. Карлаў і В.Н. Карпіевіч, прадстаўнікі Жодзінскай гарадской арганізацыі ветэранаў.

# Бібліятэка і час

## *Кніжная інклюзія*

Публічная бібліятэка – універсальная ўстанова, арыентаваная на запыты розных катэгорый насельніцтва. Людзі з фізічнымі абмежаваннямі – аб’ект асаблівага клопату бібліятэкараў, якія праяўляюць актыўнасць у сферы інклюзіі. Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва другі год рэалізуе інклюзіўны доўгатэрміновы праект для маладых інвалідаў “Чароўны свет кнігі”, які дазваляе павысіць якасць бібліятэчнага абслугоўвання гэтай катэгорыі людзей, інтэграваць іх у культурнае асяроддзе, спрыяць сацыялізацыі і камунікатыўнасці.

Кніга для людзей з фізічнымі абмежаваннямі і адпаведнымі цяжкасцямі ўспрымання друкаванай інфармацыі – акно ў свет, пасрэднік перадачы жыццёвага досведу і духоўнага вопыту, унікальны сродак духоўна-маральнага, эмацыянальна-эстэтычнага развіцця асобы, духоўная спіраль, па якой уздымаецца душа. Літаратура як інклюзія дазваляе далучыцца да каштоўнасцей чытання і кнігі, развіць творчыя здольнасці, задаволіць патрэбы маладых інвалідаў у інтэлектуальным і духоўным росце.

Галоўная бібліятэка горада стала месцам цікавых і карысных стасункаў маладых інвалідаў, дзе штомесяц праходзяць цікавыя мерапрыемствы. Практыкуюцца інтэрактыўныя формы масавай прапаганды павышанага вобразна-эмацыянальнага ўплыву: кніжныя арт-гасцёўні, сеансы кнігатэрапіі, літаратурныя сімфаньеты, вулічны тэатр, летні чытай-дворык, тэатр апавядання (верша, байкі), літаратурна-рэчавыя аўкцыёны.

Чытанне – актыўны працэс далучэння да мастацкай літаратуры. З улікам таго, што маладыя інваліды абмежаваныя ў магчымасцях актыўнага самастойнага чытання,

практыкуюцца акцыі "Давайце пачытаем разам". Такія калектыўныя мастацкія чытанні – гэта не проста выразнае чытанне бібліятэкарам тэкстаў з ліста, а сапраўднае шоу, міні-спектакль, тэатр аднаго акцёра. Выбіраюцца кароткія літаратурныя творы з даходлівай мовай, дасціпным зместам, павучальным, зразумелым і простым, але цікавым сюжэтам. Прыёмы монатэатралізацыі абраных апавяданняў сучасных беларускіх празаікаў і класікаў ствараюць не толькі слыхавы, але і зрокава-ўспрымальны малюнак. Назіральнікаў у зале няма, усе – не проста гледачы, а ўдзельнікі сюжэтнай падзеі. Такая форма калектыўных чытанняў дазваляе раскрыць творы не казённа, а ў вобразна-эмацыянальнай форме, дадумаць, перайначыць сюжэт, узбагаціць свой жыццёвы досвед. Кожны, пры жаданні, можа прыняць удзел у імправізацыях "Новая канцоўка твора", "Калі б я апынуўся на месцы літаратурнага героя…", выступіць у ролі самадзейнага артыста.

Зручная мабільная форма бібліятэчнага тэатра без куліcаў – тэатра апавядання – дазваляе эмацыянальна разнастаіць мастацкія чытанні, вывесці "жывога акцёра", стварыць навідавоку яркія, запамінальныя вобразы, выклікаць у слухачоў моцныя пачуцці. Кніжны інклюзіўны міні-тэатр – гэта не мастацтва дэкарацый і акцёрскага майстэрства, а мастацтва данясення літаратурнага слова, мастацтва пераўвасаблення самадзейных акцёраў з дапамогай простых дэкарацый і прадметаў, звязаных з кульмінацыйным сюжэтам твораў.

Монатэатр "Апавяданне на біс" быў прымеркаваны да Дня маці і дазволіў убачыць і пачуць літаратурную панараму прысвячэнняў самаму блізкаму чалавеку кароткімі апавядданнямі сучасных беларускіх празаікаў. Знешняе пераўвасабленне бібліятэчнага акцёра-чытальніка дазволіла вобразна раскрыць творы, падключыць гледачоў да сумеснага роздуму над сюжэтамі апавяданняў Міхася Куляша "Дачушка", Тамары Бунта "Матуліны туфлікі", Міхася Герчыка "Кубак малака", Анатоля Бутэвіча "Стасева ялінка", Міхася Пазнякова

“Цукеркі”. Паўгадзіны арыгінальнай міні-прозы – і апавяданні “залатой кніжнай пяцёркі” загучалі.

Акцыя “Казка ўслых” прадставіла сюжэт Ніны Рыбік “Казка для дарослых”. Выклікалі цікавасць кніжныя жмуркі: экспромт-выбар таямнічых кніг, абгорнутых каляровай паперай і іх “ажыўленне” для чытацка-глядацкай публікі. Літаратурна-рэчавы аўкцыён “Назвы кніг загаварылі” па творах З. Бядулі “Сярэбраная табакерка” і У. Адоеўскага “Гарадок у табакерцы” дазволіў весці размову па актуальна-злабадзённай праблеме да Сусветнага дня без тытуню. Рэкламная дэманстрацыя кніг суправаджалася дэманстрацыяй прадмета-рэбуса, прадмета-сімвала, за адгадваннее якіх удзельнікі атрымоўвалі спецыяльныя жэтоны. Жэтоны-літы за дасведчанасць па ўзнятай тэме давалі права на выкуп прызоў.

У ходзе акцыі “Калядныя сустрэчы з кнігай” прапісалася такая форма прапаганды чытання, як літаратурныя калядкі. У імправізаваны кніжны мех пасля калектыўнага мастацкага прачытання збіраліся лепшыя калядныя апавяданні. Такім чынам, былі зладжаны тэатралізаваныя калектыўныя чытанні самых пранікнёных апавяданняў расійскіх і беларускіх аўтараў, прасякнутых святлом каляднага цуда. Сярод класічна калядных твораў Аляксандра Чорнага, Анатоля Круглова, Барыса Ганагі дастойнае месца занялі апавяданні сучаснікаў: вядомай пецярбургскай пісьменніцы Ірыны Рагалёвай і аматараў прыгожага пісьменства – беларускай журналісткі Настассі Нарэйка і расіяніна Руслана Вяземскага.

У рамках праекта “Чароўнае святло кнігі” супрацоўнікі раённай бібліятэкі ладзілі для маладых інвалідаў інклюзіўныя арт-гасцёўні “Сустрэчы з кнігай”. Пасяджэнні арт-гасцёўні ў камернай абстаноўцы суправаджаліся монатэатралізацыяй. Падчас сустрэчы ў арт-гасцёўні да 100-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна тэатр Бярэзінскай раённай бібліятэкі “Жывая кніга” ажывіў сюжэты апавяданняў юбіляра “Хітрунння” і “Шэршні”, прадставіў на фоне перасоўных экспазіцый маналогі хлопчыка-сведкі расправы акупантаў з матуляй і сястрычкай паводле рамана “Вазьму

твой боль” і няўцешнай маці сям’і, якая пацярпела ад наступстваў чарнобыльскай трагедыі, паводле рамана “Злая зорка”. Аздабленнем эпізодаў з аповесці “Вернісаж” сталі карціны мастацкага салона раённага цэнтра рамёстваў, дзе праходзіла пасяджэнне арт-гасцёўні. Гледачы мелі магчымасць экспромтам паўдзельнічаць у прадстаўленні і паўплываць на фінал, часам кардынальна яго перайначыць.

Інклюзіўная арт-гасцёўня “Літаратурныя галасы Бярэзіншчыны” была прысвечана творчасці пісьменніка, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі, уладальніка медаля Францыска Скарыны, Міхася Пазнякова, які ў 70-я гады настаўнічаў на Бярэзіншчыне. Падчас чытацка-тэатралізаванай імпрэзы калектыўна прачыталі найлепшыя творы літаратара, паяднанага лёсам з Бярэзінскім краем. Маладыя інваліды з ахвотай выступалі ў ролі самадзейных артыстаў калектыўна зладжанага літаратурнага прадстаўлення па апавяданнях М. Пазнякова “Вяртанне з фронту”, “Клён”, “Цукеркі”, “Голас” і гумарэскі “З новым падыходам”. Літаратурная арт-гасцёўня падарыла ўсім прыгажосць мілагучнай беларускай мовы, захапленне цікавымі сюжэтамі, магчымасць праявіць аматарскія здольнасці.

Цыкл літаратурных сімфаньет “Літаратурныя шэдэўрыкі” – жывое мастацкае прачытанне твораў беларускіх аўтараў кароткага фармату ў абавязковым музычным суправаджэнні – кароткіх санат кампазітараў-класікаў. Як правіла, гэта чатыры кароткія міні-апавяданні з павучальнымі сюжэтамі павышанага душэўнага ўзрушэння. Найбольшы рэйтынг атрымалі апавяданні Таццяны Гарэлікавай “Два бананы”, Зіновія Прыгодзіча “Стрэл на змярканні”, Уладзіміра Сцяпана “Капейка”, Валянціны Кадзетавай “Пуховая хустка”. Падчас гэтых мерапрыемстваў прымяняўся прадметна-рэчавы, наглядна-запамінальны прыём: у фінале была вынесена чорная скрынка з рэчамі, якія належаць героям або ілюструюць кульмінацыйны фінал літаратурнага сюжэта. Традыцыйным завяршэннем літаратурных сімфаньет выступае бліц-конкурс на самага ўважлівага чытача, які атрымоўвае прыз.

Інклюзіўная гадзіна дабрыні “Зямны анёлак” прайшла ў галерэі раённага цэнтра рамёстваў. Зачынам да шчырай размовы паслужыла выстава карцін расійскай мастачкі Алены Войнавай-Багародзіцкай “Час анёлаў”. Вобразна-эмацыянальна прадставіць светлы, выратавальны, часам ахвярны вобраз зямнога анёла, ахоўніка сваіх дзяцей, дазволілі нявыдуманыя жыццёвыя гісторыі, прытчы, вершы і інтэрмедыі пра матуль. Інклюзіўным аспектам выступалі вышываныя карціны цыкла “Маці і дзіця – вянец прыроды” маладога інваліда-калясачніка, жыхара Беразіно, П. Картэля.

У гонар Міжнароднага дня аховы дзяцей і Сусветнага дня бацькоў супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі наведвальнікам аддзялення дзённага знаходжання маладых інвалідаў Бярэзінскага ТЦСАН гадзіну шчырасці “Пад крыламі бацькоўскай любові”. Монатэатралізаваныя жыццёвінкі “Падгледжана ў жыцці” прадставілі галерэю сямейных гісторый. Сіла мастацкага слова, узмоцненая цікавымі фактамі і сюжэтамі літаратурных твораў з выкарыстаннем “гаворачых” рэквізітаў, застаўляла маладых людзей задумацца і пераасэнсаваць свае ўзаемаадносіны з бацькамі.

У летні сезон запатрабаваны вулічныя формы прапаганды кнігі для людзей з абмежаваннямі. Кніга выходзіць у адкрытую прастору ў нечаканай форме кніжнага арт-парада, прымушае гледачоў не проста дагледзець і дачытаць да канца, а ўцягнуцца ў сюжэт, атаясамляючы сябе з героямі, уявіць сябе сведкам або ўдзельнікам з выбарам таго героя, учынкі якога больш зразумелыя і ўласна адабральныя. Тэатр без кулісаў разгортваецца на адкрытых пляцоўках каля бібліятэчнай установы. Цёплымі летнімі дзянькамі збіраюць маладых інвалідаў інклюзіўныя вулічныя акцыі “Чытай-дворык пад ліхтаром міласэрнасці”, “Чытай-дворык пад сонцам дружбы”, “Чытай-дворык пад зоркай памяці”.

Найчасцей размяшчаліся летнія чытай-дворыкі ў зелені дрэў на пляцоўцы раённага цэнтра рамёстваў, дзе роставыя драўляныя скульптуры суседнічалі з яркімі кніжнымі стэлажамі, каляровымі лавачкамі і столікамі з перыёдыкай. У

зялёнай зоне дваровай тэрыторыі былі прадстаўлены інтэрактыўныя пляцоўкі адпаведна профілю чытай-дворыка. “Чытай-дворык пад ліхтаром міласэрнасці” прапанаваў імправізаваную праграму “Плады міласэрнасці з Дрэва жыцця” з ужываннем прыёмаў монатэатралізацыі гісторый з Чорнай і Чырвонай кніг. Наведвальнікі спазнавалі асновы спагадлівых адносінаў да прыроды, пажылых і нямоглых людзей, родных і сваякоў. Запальвалі светлячкі-маячкі ад ліхтарыка феі Дабрыні, спрабавалі “залатыя яблычкі” з Дрэва жыцця, шукалі ключык да чароўнага куфэрка кніжна-жыццёвай мудрасці “Жывое любіць – добрым быць”. Гаспадыня “Чытай-дворыка пад сонцам дружбы” – Каралева Кніга – прэзентавала энцыклапедыю сяброўства з куфэрка дружалюбства. Ад дотыку яе чароўнай палачкі ажылі пазнавальна-займальныя і павучальныя кнігі. Маладыя людзі маглі прыняць удзел у імправізацыі сюжэтаў гэтых гісторый. Кніжны павільён прапаноўваў літаратурныя навінкі аб сяброўстве і сябрах.

На інтэрактыўнай пляцоўцы патрыятычнага чытай-дворыка ў ходзе акцыі “Чытаем разам кнігі аб вайне” вулічны тэатр кнігі “Вайна вачыма дзяцей” прадставіў шчымлівыя аповеды герояў твораў пра ваеннае маленства Віктара Улюценкі “Абпаленае дзяцінства”, Анатоля Смалянкі “Пілотка”, Віктара Праўдзіна “Пяць цукерак ад фрыца”, Галіны Васілеўскай “Белыя парасончыкі з таполі”, Андрэя Герашчанкі “Ваверчаня”. Наведвальнікі чытай-дворыка ахвотна ўдзельнічалі ў імправізаваных міні-сцэнках па сюжэтах твораў і атрымоўвалі прызы.

У капілцы арыгінальных форм праекта – сеансы кнігатэрапіі, так званыя лячэбныя сеансы кароткімі апавяданнямі пазітыўнага зместу з аптымістычным фіналам, гумарыстычным сюжэтам, станоўчым псіхалагічным уплывам і псіхалагічнай напоўненасцю. Менавіта такія апавяданні сталі літаратурнай базай кнігатэрапіі, прайшлі праверку ў аўдыторыі маладых людзей з фізічнымі абмежаваннямі і іх сваякоў. Публіцы былі прадстаўлены літаратурныя замалёўкі паводле апавяданняў К. Чапэка “Хворы і кніга”, С. Цвейга “Не адкажы

сабе ў кнізе", І. Стадольніка "Паліто з каракулевым каўняром", С. Бурштына "Дзед у бальніцы", Н. Нарэйка "Хачу быць з табой", Т. Дземідовіч "Бывай, цёця Ізаўра!", С. Грынкевіча "Ліфт", М. Чарняўскага "Не ўсё тое смачнае, што з маслам", В. Сазонава "Бабулін шаптун", А. Карніенкі "Незнаёмка ў кватэры".

"Кніга нашага жыцця – родны горад!" – пад такім лейтматывам прайшла экскурсія па Беразіно наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання маладых інвалідаў ТЦСАН. Цікавыя факты з гісторыі мястэчка дазволілі зірнуць на родны горад зацікаўленнымі вачыма, здзівіцца і адчуць гонар.

Праблема пашырэння доступу да інфармацыі, кнігі і чытання асобаў з асаблівасцямі развіцця застаецца вельмі актуальнай. Людзі з фізічнымі абмежаваннямі і цяжкасцямі ўспрымання друкаванай інфармацыі, якім адрасаваны сумесны інклюзіўны праект Бярэзінскай раённай бібліятэкі і ТЦСАН "Чароўнае святло кнігі", атрымліваюць магчымасць творчых чытацкіх стасункаў, пашыраюць свой інтэлектуальна-культурны кругагляд, карысна праводзяць час з магчымасцямі эмацыянальна-творчага самавыяўлення, пашыраюць сваю жыццёвую актыўнасць, набываюць камунікатыўныя навыкі ўзаемаадносінаў. І мы, бібліятэкары, рады ім ў гэтым дапамагаць.

*Круталевіч Т.М.,*
*загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*ДУК"Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка"*

## ***Пазнаць тую зямлю, на якой жывеш***

*( з вопыту работы па краязнаўстве*
*Халопеніцкай гарпасялковай бібліятэкі*
*ДУК "Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы")*

Неад'емнай часткай работы бібліятэкі з'яўляецца краязнаўчая і пошукавая дзейнасць, якая вядзецца пастаянна і планамерна. Кожнаму чалавеку, кожнаму народу трэба ўсведамляць сваё месца сярод іншых людзей і народаў. Гэта немагчыма без ведання гісторыі, без вывучэння культуры, звычаяў і традыцый сваёй Радзімы. Кожны чалавек звязаны з мінулым, сённяшнім і будучым сваёй краіны, таму неабходна, каб кожны з нас добра ведаў свае вытокі, гісторыю, культуру роднага краю.

Трэба адзначыць, што мястэчка Халопенічы – гэта радзіма многіх знакамітых пісьменнікаў, паэтаў, навукоўцаў, сярод якіх вядомы этнограф, вучоны, бацька паэта Максіма Багдановіча Адам Багдановіч, паэт Васіль Зуёнак, паэт і журналіст  Валерый Грышановіч, святар Іаан Варанец (быў кананізаваны як святы), навукоўцы Андрэй Ганчарэнка, Віктар Берман, Анатолій Шаркоў. Гэты спіс можна працягваць і далей. Таксама вялікая колькасць людзей, якія жылі і працавалі ў Халопенічах  і менавіта тут выявілі сябе як будучыя знакамітасці. Сярод іх вядомыя ўрачы, інжынеры, спартсмены, работнікі культуры.

Бібліятэцы таксама пашанцавала на творчых, зацікаўленых работнікаў, якія збіралі краязнаўчы матэрыял, захоўвалі і перадавалі нашчадкам. Гэта і Казлова С.П., і Аўласенка М.В., і Геут А.М., і Каляда С.М., і Макарэвіч Т.С. і інш.

У 2010 годзе ў бібліятэку прыйшла працаваць малады спецыяліст Антончык Кацярына Уладзіміраўна, сапраўдны прафесіянал, эрудыт. Яе захапленне гісторыяй роднай зямлі,

абрадамі і звычаямі сваёй мясцовасці дапамагло развіццю краязнаўчай работы. Бібліятэкар наведвала старажылаў сваёй мясцовасці, у памяці якіх захаваліся звычаі, абрадавыя традыцыі, знайшла да іх падыход, выклікала на размову і запісала іх успаміны. Сабраныя па крупіцах матэрыялы былі афармлены ў “Старонкі гісторыі. Летапіс пасёлка Халопенічы.” Візітнай карткай пасёлка з’яўляецца стылізаваны світак паперы, на якім адлюстраваны асноўныя даты жыцця пасёлка. Тут можна знайсці звесткі, пачынаючы з першых успамінаў пра паселішча, якому ў 2021 годзе споўнілася 570 гадоў.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі шматгранная: арганізацыя пошукава-даследчай дзейнасці, фарміраванне найбольш поўнай калекцыі краязнаўчых дакументаў на любых носьбітах, раскрыццё народнай творчасці таленавітых землякоў і інш.

З 2016 года Халопеніцкая гарпасялковая бібліятэка працуе па краязнаўчай праграме “Жыву і дыхаю, мой Крупскі край, табой!”, мэта якой – вывучэнне роднага краю, яго гісторыі, культуры, традыцый, выхаванне ў падрастаючага пакалення пачуцця павагі да нашых сучаснікаў, гонару за поспехі і дасягненні землякоў, пашырэнне цікавасці да гісторыі роднай Крупшчыны. У рамках праграмы праводзілася шмат цікавых мерапрыемстваў: вечар-сустрэча “Талент жыве ў вёсцы”, літаратурна-краязнаўчы вечар “Зямля мая, край маляўнічы”, вечар гісторыі “Я і мой радавод”, тэматычны вечар “Кола народных святаў”, краязнаўчыя чытанні “Славутыя імёны зямлі Крупскай”, літаратурная гасцёўня “Багата родная мова мая”, краязнаўчыя гадзіны “Ведай гісторыю сваёй зямлі” і “Хто ёсць хто ў Халопенічах”, краязнаўчыя падарожжы “Родам з нашых мясцін” і “Быт, звычаі, рытуалы, святы беларускіх сялян”, літаратурная гадзіна “Пісьменнікі роднага краю”, этнаграфічная гадзіна “Адзенне нашых продкаў” і інш.

Пры бібліятэцы з 2015 года працуе гурток для дзяўчынак “Девичьи секреты”, які наведваюць дзяўчынкі ўзростам да 15 гадоў. Шмат паседжанняў праводзілася па краязнаўстве. Гэта і экскурсіі па гістарычных мясцінах пасёлка, і конкурс малюнкаў “Мой родны край”, і конкурс замалёвак “Якой я бачу сваю малую Радзіму ў будучым”, і краязнаўчая гульня-віктарына “Чым славуты наш пасёлак” і інш.

Бібліятэкар Халопеніцкай гарпасялковай бібліятэкі займаецца пошукавай дзейнасцю, сабрана шмат мясцовых песень, прымавак, абрадаў, прыказак і інш. Аформлены тэматычныя папкі “Паселішчы Крупшчыны”, “Адкуль нашы карані”, “Крупшчына паэтычная”, “Абрады майго пасёлка”. У тэматычнай папцы “Вас помнит мир спасённый” , прысвечанай землякам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, акрамя ўспамінаў, змяшчаюцца дакументы, фотаздымкі і лісты з фронту (з сямейных архіваў), складзены спісы ўдзельнікаў і ветэранаў вайны. Таксама ў бібліятэцы сабраны матэрыялы аб сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Папка “Халопеніцкі механічны завод” змяшчае матэрыялы, пачынаючы з 1979 года. Гэта і сацыялістычныя абавязацельствы, і пратаколы прафсаюзных сабранняў, шмат фотаздымкаў лепшых работнікаў і іншыя матэрыялы. Таксама са слоў ураджэнкі Халопеніч, краязнаўцы Аляхновіч А. Я., сабраны і запісаны мясцовыя дыялекты. Акрамя тэматычных папак, бібліятэкар распісвае перыядычныя выданні для папаўнення краязнаўчай картатэкі.

У бібліятэцы аформлены куток сялянскага побыту “Бабін кут”. Экспанаты, сабраныя бібліятэкарам і чытачамі, адлюстроўваюць свет мінуўшчыны, лад жыцця. У кутку сабраны розныя прылады працы: серп, пралка, прас, калаўрот, цэп, сталовы і кухонны посуд. На стэндзе “Скарбы бабуліных куфраў” размешчаны вышытыя рушнікі, саматканыя пасцілкі і палавікі, якія захаваліся з даўніх часоў. На выставе “Прыгожае

сваімі рукамі” прадстаўлены вырабы чытачоў бібліятэкі: вышыўкі, выцінанкі, вязаныя рэчы, малюнкі, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Бібліятэкар супрацоўнічае з мясцовым філіялам Крупскага цэнтра творчасці. На працягу года былі арганізаваны выставы падзелак дзяцей гуртка дадзенай установы: “Пасхальныя перазвоны”, “Навагоднія цуды”, “Мілая, родная, каханая” (да Дня маці), “Калядная казка” і інш.

Традыцыйным стала правядзенне штогод у пасёлку раённага свята “Халопеніцкі карагод”. Бібліятэкар таксама не застаецца ў баку ад падрыхтоўчай працы і падчас правядзення мерапрыемства: афармляе кніжныя выставы, прысвечаныя знакамітым землякам, пісьменнікам, ладзіць выставы майстроў пасёлка.

Ацаніць і па-сапраўднаму зразумець гісторыю сваей Бацькаўшчыны, дапамагчы даведацца пра мінулае і сённяшнія дні роднага краю, выхаваць павагу і любоў да сваёй мовы, традыцый свайго народа, далучыць чытачоў да прыгажосці народнага мастацтва дапамагаюць змястоўныя масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў бібліятэцы. Гэта і краязнаўчыя гадзіны, падарожжы, літаратурна-гістарычныя экскурсіі, вечарыны. Так, цікавымі і запамінальнымі былі наступныя мерапрыемствы: падарожжа ў даўніну “Вякоў мінулых слаўныя імёны”, краязнаўчыя гадзіны “Імя ў гісторыі пасёлка”, “Таленты роднай зямлі”, літаратурны вернісаж “Наш край родны ў вершах”, краязнаўчы дайджэст “Датуль народ жыве, пакуль сваю гісторыю шануе”, экскурс “Жывыя сведкі гісторыі”, вусны часопіс “Любі і знай свой родны край”, краязнаўчыя экспедыцыі “Традыцыі нашых продкаў”, “Прикоснись к истории края” і інш.

Значнае месца бібліятэкар адводзіць патрыятычнаму выхаванню на аснове мясцовага матэрыялу. Да Дня Перамогі была аформлена выстава “Фотографии с семейного альбома”, праведзены гадзіны мужнасці “Паклонімся подзвігу салдат”,

“Залатыя зоркі Крупчан”, “І боль, і памяць, і жыццё”, “Сэрца памятае кожны бой”, “Герой бессмяротны, пакуль пра яго помняць”, тэматычныя вечары “Ішоў край дарогамі вайны”, “Этих дней не смолкнет слава”, “Сквозь года звенит Победа”, гадзіна роздуму “Памяць сэрца”, вечар памяці “Нам жыць і памятаць”, патрыятычная гадзіна “Кніга “Памяць” расказвае”, гадзіна памяці “Землякі – салдаты Перамогі” і інш.

Стала ўжо традыцыйным віншаванне ветэранаў вайны, а таксама былых культработнікаў у рамках акцыі “Спешим делать добро”. Бібліятэкар сумесна з клубным работнікам наведваюць іх з невялікімі падарункамі і кветкамі. За кубачкам гарбаты ўспамінаюць яны пра свае маладыя гады, пра жыццё Халопеніч ў даваенны час, пра цяжкасці пасляваенных гадоў, пра будні і святы пасёлка.

Таксама ва ўвазе бібліятэкара знаходзіцца літаратурнае краязнаўства, прыгожа аформлена кніжная выстава “Крупшчына літаратурная”, праводзяцца мерапрыемствы да юбілеяў пісьменнікаў і паэтаў-землякоў: літаратурны вечар-партрэт да 80-годдзя з дня нараджэння Рыгора Касенкі “Напісанае застанецца”, паэтычная гадзіна да 50-годдзя з дня нараджэння Алены Якаўлевай “Я веру, што жыццё не пустацвет…”, музычна-паэтычная вечарына да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Цітаўца “Любі і праслаўляй свой родны край!”, літаратурнае знаёмства да 70-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Баравулі “Я не паэт – я боль людскі”, гадзіна мастацтва да 75-годдзя з дня нараджэння Галіны Фатыхавай “Зямля майго дзяцінства” і інш.

Бібліятэкар цесна супрацоўнічае з работнікамі Халопеніцкага гарпасялковага Дома культуры па адраджэнні і зберажэнні народных промыслаў і рамёстваў, папулярызацыі творчасці і фальклорных традыцый. Сумесна былі праведзены фальклорна-этнаграфічныя святы “Добры вечар, шчодры вечар”, “На Купалу ночкі мала”, фальклорнае свята-конкурс

“Яблыні і яблычкі”, краязнаўчае падарожжа “Святы беларускіх сялян”, абрадавае свята “Масленіца” і інш.

У сувязі з набыццём камп’ютарнай тэхнікі з’явілася магчымасць друкаваць сабраны матэрыял. Так, у апошні час былі распрацаваны і выдадзены буклеты “Яна жыве, народная памяць” (прысвечаны А. Багдановічу), “Паэту насцеж адкрыты свет” (прысвечаны В. Зуёнку), “Скацілася з небасхілу зорка” (прысвечаны В. Грышановічу), цыкл лістовак, прысвечаных знакамітым землякам: Берману В.М., Ганчарэнку А.М., Варанец І.В, Шаркову А.В.

Халопеніцкая гарпасялковая бібліятэка прымала ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе на лепшы летапіс бібліятэкі альбо вёскі “Гартаючы старонкі гісторыі”, на якім з матэрыяламі па гісторыі пасёлка “Старонкі гісторыі. Летапіс пасёлка Халопенічы” заняла першае прызавое месца.

*Васілевіч В.Р.,*
*загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы”*

## ***Волшебство книжног лета***

Организация досуга юных читателей в летнее время – неотъемлемая часть работы библиотек ГУК «Логойская районная центральная библиотека». Летнее чтение активизирует у ребят интерес к книге, приобщает к культуре чтения, развивает детскую фантазию, творческие способности и в какой-то мере решает проблемы занятости детей и подростков в дни летних каникул.

В летний период библиотеки стараются работать в тесном контакте со школами, дошкольными учреждениями, домами культуры и сельскими клубами, летними оздоровительными лагерями, школьными площадками.

Чем заполнить свободное время детей и подростков? Как сделать, чтобы летом им было интересно с книгой? Для этого библиотекари используют различные формы работы, в том числе игровые, что позволяет превратить процесс чтения в увлекательное занятие. В игре моделируются различные ситуации, например, путешествие, экскурсия и т.д. Игры в библиотеках направлены на получение новых знаний, новой информации. Самыми распространенными играми в библиотеке являются многообразные конкурсы: конкурс на лучший рисунок, конкурс на лучшего читателя, конкурс на лучшее знание книги, литературные конкурсы, семейные конкурсы.

На современном этапе работы в библиотеках стала использоваться такая форма работы, как театрализация, в основе которой как раз и лежит игровое поведение. Наиболее доступная форма театрализации приводит к возникновению творческого потенциала у библиотекарей и читателей.

“Волшебство книжного лета” – под таким названием организована работа с несовершеннолетними в период летних каникул в библиотеках ГУК “Логойская районная центральная библиотека”. Главная задача библиотек в этот период заключается в том, чтобы охватить содержательным отдыхом как можно больше школьников, расширить их кругозор, научить искусству общения, а через увлекательные мероприятия познакомить своих юных посетителей с богатством книжных фондов, рассказать о наиболее интересных книгах и журналах.

В первый день лета отмечается Международный день защиты детей – один из самых радостных праздников счастливого детства. Библиотекари Логойской районной детской библиотеки пригласили юных читателей в парк культуры и отдыха на праздник детства “Лето в стране книжных чудес”. На тематической площадке можно было познакомиться с красочными изданиями на книжной выставке

“В гостях у лета книжного”, присесть, отдохнуть, полистать интересные книги и журналы, раскрасить понравившиеся картинки. Для любознательных и начитанных ребят были проведены различные конкурсы под общим названием “В центре внимания книга”.

Библиотекарь Гостиловичской сельской библиотеки организовала праздник “Планета детства под созвездием добра”. К мероприятию была подготовлена красочная книжная выставка “Весь мир на страницах книг”. Весёлые клоуны провели с ребятами игры, занимательные конкурсы. Дети с удовольствием отгадывали загадки, участвовали в танцевальных композициях. Завершился праздник традиционным конкурсом рисунков на асфальте.

Библиотекари Плещеницкой детской библиотеки организовали обширный игродром “День веселья”. Три команды ребят выполняли различные задания: отвечали на вопросы сказочного лото, составляли на скорость слова в игре “Словодел”, отвечали на вопросы видеовикторины. В конце мероприятия был показан мультфильм о правилах поведения на улице из серии “Аркадий Паровозов спешит на помощь”.

В Завишинской сельской библиотеке-клубе состоялся утренник “Ах, эта дивная пора…июнь”. Дети с удовольствием приняли участие в подвижных играх, шуточных конкурсах, викторинах. Они пели, танцевали, читали стихи о лете, в конкурсе рисунков проявили фантазию, изобразив свою семью, любимых животных, летние пейзажи и многое другое. Дети получили позитивные эмоции, весёлое настроение и сладкие призы.

День защиты детей под названием “Дадим шар земной детям” был организован в Метличицкой сельской библиотеке. Библиотекарь познакомила ребят с “Конвенцией о правах ребёнка”, провела литературно-правовую викторину “Права литературных героев”, игру “Вместе играем – рифму

подбираем”. Дети с удовольствием участвовали в конкурсе рисунков “Когда на планете хозяева – дети”.

Библиотекарь Каменской сельской библиотеки пригласила ребят, посещающих школьную оздоровительную площадку, на праздник “Путешествие в страну Счастливию”. Для них прозвучала интересная информация о возникновении Дня защиты детей “1 июня – это?”. Затем школьники отвечали на вопросы “Мультяшной викторины” и участвовали в конкурсе рисунков “Разноцветная радуга”.

Библиотекарь Октябрьской сельской библиотеки организовала игру по сказкам “Путешествие по Вселенной”. В Коренской сельской библиотеке состоялся праздник “Путешествие в страну детства”. В Гайненской сельской библиотеке-клубе – конкурс рисунков “Радуга талантов”. Праздник детских игр “Главное на свете – это наши дети” проведен Задорьевской сельской библиотекой. Конкурс чтецов “Шагает детство по планете” – Калачевской сельской библиотекой.

В занимательной форме проведены различные викторины: “Что за прелесть эти сказки!”, “Любимые герои”, “Четыре заветных желания”, “Идёт сказка в гости к нам”, “Вспомни сказку по началу”, “А у сказки тихий голосок”, “Юбилей волшебных книг”. Состоялись викторины в Логойской и Плещеницкой детских библиотеках, Гайненской и Завишинской сельских библиотеках-клубах, Калачевской, Коренской, Семковской сельских библиотеках. В Плещеницкой детской библиотеке, Гайненской сельской библиотеке-клубе, Гостиловичской сельской библиотеке были организованы игры и квест-игры: “Вот и наступило лето”, “Книжкин дом”, “Маленькие чудеса большой природы”, “Книжный аукцион”, “Забывчивый гид”. В Метличицкой сельской библиотеке – мастерская поделки “Шишек много не бывает” и “Эколюдик”.

Летом общая атмосфера в библиотеке отличается от обычной. Библиотекари, прежде всего, стараются создать комфортную среду в библиотеке: оформляют выставки с летней тематикой, информационные стенды, уголки, направленные на пропаганду книги и чтения. В период летних каникул вниманию читателей были предложены обзоры детских книг “Летних книжек карусель” и “Летнее чтение зовёт в приключения” в Логойской районной детской библиотеке, выставки-знакомства “Новинки из книжной корзинки” и “Дерево книжных предпочтений” в Янушковичской сельской библиотеке, литературные гонки “Читаем друг другу – читаем по кругу” в Семковской сельской библиотеке, уголок чтения “Летним днём в гостях у книжек” в Метличицкой сельской библиотеке, книжная выставка “Советы для ребят школьной планеты” в Гайненской сельской библиотеке-клубе, книжная выставка “Весь мир на страницах книг” в Гостиловичской сельской библиотеке.

Актуальными темами для детей в данный период являются экология, основы безопасности жизнедеятельности, здоровый образ жизни. В этих направлениях библиотекарями проводятся мероприятия различных форм: познавательная игра-викторина “Волшебница природа” в Октябрьской сельской библиотеке, путешествие в мир лекарственных трав “Травинка-витаминка” и экологическое путешествие “Звезда по имени “Солнце” в Гостиловичской сельской библиотеке, “С лукошком в путь дорожку” в Калачевской сельской библиотеке, экскурсия “Созерцание чуда” в Каменской сельской библиотеке, экологическая викторина “Любите чудо из чудес: леса, озёра, синь небес” в Семковской сельской библиотеке.

В летний период особое внимание уделяется теме профилактики дорожно-транспортных происшествий. Для того чтобы ребята чувствовали себя в безопасности, были внимательными и осторожными, соблюдали правила

дорожного движения, библиотекари провели следующие мероприятия: игру “Путешествие в страну Светофорию”, познавательный час “Осторожно, гроза!”, беседу “Светоотражающий элемент – мой дорожный талисман” (Завишинская сельская библиотека-клуб), книжную выставку “Дорожное движение – безопасность жизнедеятельности” (Задорьевская сельская библиотека), беседу-напоминание “Лето без опасности” (Янушковичская сельская библиотека).

Летом в целях пропаганды здорового образа жизни и профилактики вредных привычек среди детей и подростков библиотеками проведены были такие мероприятия: выставка-призыв “Над пропастью…” в Логойской районной детской библиотеке, урок-размышление “Пить или отказаться?” в Гайненской сельской библиотеке-клубе, встреча с медработником “Алкоголизм – беда общая” в Семковской сельской библиотеке.

Сотрудники библиотек со всей серьёзностью и ответственностью подходят к планированию организации летних мероприятий. Они ищут способы сделать их содержательными, интересными и запоминающимися. Библиотекари постоянно ведут поиск новых, нестандартных форм популяризации книги и чтения среди детей, стараются привносить что-то новое в традиционные, хорошо зарекомендованные формы и методы своей деятельности. Ребята окунаются в мир самых таинственных, самых смешных, самых волшебных мероприятий.

Летние каникулы пролетают очень быстро. И только от нас и от нашей работы зависит, какие впечатления от этих дней останутся у ребят: серые, неинтересные и похожие друг на друга или яркие, разноцветные и незабываемые.

*Глушакова И.Н.,*
*главный библиотекарь ОБМ*
*ГУК «Логойская районная*
*центральная библиотека»*

### *“Голасам свайго пакалення”*

27 красавіка 2021 года ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў V Фестываль паэзіі “Голасам свайго пакалення”, прысвечаны беларускаму паэту, Ганароваму грамадзяніну горада Нясвіжа, ветэрану Вялікай Айчыннай вайны – Паўлюку Пранузе.

На Нясвіжчыне шмат людзей, якія пакінулі свой адметны аўтограф у яе гісторыі. Павел Кузьміч Прануза не выключэнне. Значны ўклад ён унёс у літаратурную спадчыну нашай краіны, і таму невыпадкова шэсць гадоў таму Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы было прысвоена імя Паўлюка Пранузы, што стала своеасаблівым штуршком для арганізацыі і правядзення штогадовага Фестывалю паэзіі, які носіць імя нашага паэта-земляка. Сёлета Фестываль праходзіў у пяты раз.

У фестывальны дзень прысутныя ўзгадалі яго творчасць, успомнілі, якім ён быў. На адкрыцці Фестывалю паэзіі ўсіх шчыра вітала дырэктар Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Паўлюка Пранузы, дэпутат Мінскага абласнога Савета дэпутатаў – Людміла Іванаўна Вітко. На сустрэчу прыехаў сябар Паўла Кузьміча, Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, грамадскі дзеяч – Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі. На працягу многіх гадоў паміж імі склаліся добрыя сяброўскія адносіны. З хваляваннем у голасе Уладзімір Сцяпанавіч распавядаў пра розныя моманты, звязаныя з сябруком, падараваў у музей бібліятэкі рэчы, якія былі яму асабіста дарагія. Пранікнёныя словы пра паэта сказала член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ірына Аляксандраўна Карнаухава.

Падчас сваёй педагагічнай дзейнасці ў Нясвіжы Павел Кузьміч кіраваў літаратурным аб’яднаннем, якое працавала пры раённай газеце. Паэт Паўлюк Прануза быў нярэдкім

госцем рэдакцыі газеты, часта прыходзіў з падборкай новых вершаў. Намеснік галоўнага рэдактара раённай газеты "Нясвіжскія навіны" Соф'я Уладзіміраўна Любанец зачытала некаторыя радкі з вершаў Паўла Кузьміча, дала парады маладым паэтам. На мерапрыемстве прысутнічала Хвір Раіса Нікадзімаўна, якой пашчасціла асабіста ведаць Паўла Кузьміча. Яна таксама падзялілася сваімі ўспамінамі.

У рамках Фестывалю мерапрыемствы ладзіліся на некалькіх пляцоўках адначасова з моманту адкрыцця бібліятэкі і амаль да вечара.

Літаратурная гасцёўня "Мая зямля — жыцця майго калыска" пазнаёміла з жыццём і творчасцю паэта. Прысутныя мелі магчымасць паразважаць над тым, якім жа ён быў. Настаўнік, паэт, франтавік і проста Чалавек з вялікай літары… Падчас мерапрыемства гучалі вершы паэта. У ролі чытальнікаў выступалі вучні ДУА "Нясвіжская гімназія": Гаруноў Гасан, Жук Дар'я, Рагалевіч Арцём, Навоша Аляксандра і вучаніца ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Нясвіжа" Тарасевіч Марына. Іх выступленні ўразілі сваім артыстызмам і пранікнённасцю.

У пачатку сакавіка Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка ў рамках Фестывалю паэзіі аб'явіла конкурс ілюстрацый да вершаў Паўлюка Пранузы "Фантазія алоўка і слова". 27 красавіка адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы. У канферэнц-зале дэманстраваліся лепшыя работы мастакоў, якія пранікліся паэзіяй Паўла Кузьміча настолькі, што вырашылі верш адлюстраваць у малюнку.

Былі вызначаны пераможцы. Ва ўзроставай групе звыш 14 гадоў дыплом атрымала Сцефановіч Яна, 15 гадоў (ілюстрацыя да верша "Раніца ў лесе", ДУА "Нясвіжская дзіцячая школа мастацтваў", кіраўнік — Шыцько Аксана Юр'еўна). Ва ўзроставай групе да 14 гадоў I месца атрымала Лагвіненка Аляўціна, 12 гадоў (ілюстрацыя да верша "Рукі вясны", ДУА "Нясвіжская дзіцячая школа мастацтваў", кіраўнік — Канавалава Марына Пятроўна); II месца —

Шыбко Паліна, 12 гадоў (ілюстрацыя да верша “Ты будзь маім сонцам”, ДУА "Нясвіжская дзіцячая школа мастацтваў", кіраўнік — Канавалава Марына Пятроўна); III месца раздзялілі Зубовіч Кацярына, 13 гадоў (ілюстрацыя да верша "Хто асінку напалохаў?", ДУА "Нясвіжская дзіцячая школа мастацтваў", кіраўнік — Шыцько Аксана Юр’еўна) і Леванчук Яўгенія, 10 гадоў (ілюстрацыя да верша "Радуга”, ДУДА "Цэнтр дзіцячай творчасці Нясвіжскага раёна", кіраўнік — Гаціла Алена Генадзьеўна). Дыпломам адзначана і работа Еўшаль Варвары, 9 гадоў (ілюстрацыя да верша "Браты", ДУДА "Цэнтр дзіцячай творчасці Нясвіжскага раёна", кіраўнік — Гаціла Алена Генадзьеўна).

Работы, прадстаўленыя на выставе, увайшлі ў эксклюзіўны друкаваны літаратурны зборнік “Фантазія алоўка і слова”. У ім змяшчаецца верш паэта і ілюстрацыя да яго ўдзельнікаў конкурсу. Мастакі, чые работы журы вылучыла сярод астатніх, атрымалі на памяць гэты літаратурны зборнік, а таксама падарункі.

Павел Кузьміч Прануза быў настаўнікам, які выхаваў не адно пакаленне ўдумлівых, разважлівых чытачоў. І сёння многія з іх пастаянна наведваюць нашу бібліятэку, добрым словам успамінаючы свайго настаўніка. Павел Кузьміч ведаў многіх пісьменнікаў і паэтаў, якія прыязджалі адпачываць у Нясвіжскі санаторый. Карыстаючыся гэтым момантам, Паўлюк Прануза арганізоўваў у школе літаратурныя сустрэчы, тым самым пераўзыходзячы межы праграмы. Добры пачын нашага земляка мы працягваем, праводзячы ў рамках Фестываляў у яго гонар прэзентацыі кніг нашых сучаснікаў, сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Адной з намінацый сёлетняй падзеі стала прэзентацыя кнігі Ірыны Карнаухавай і Міхаіла Разаева «Две родины — одна страна». Ірына Аляксандраўна мае расійскія карані. Яе бацькі родам з Курска, хаця нарадзілася яна ў Баранавічах і ўсё жыццё пражыла ў Беларусі. У 2018 годзе нашай госці было

прысвоена ганаровае званне «Курскі салавей». З таго часу яе звязвае добрае знаёмства з сааўтарам прэзентуемай кнігі Міхаілам Разаевым.

Ірына Аляксандраўна пазнаёміла маладых людзей з вершамі, змешчанымі ў зборніку, рассказала аб падзеях, якія натхнілі яе на стварэнне гэтых твораў. Асноўныя тэмы кнігі — тэма Радзімы, Вялікай Айчыннай вайны, тэма выбару ў складаных жыццёвых абставінах. У прэзентацыі кнігі ўдзел прынялі ўдзельнікі сумеснага праекта "Парады з вуснаў несвіжан": бібліятэка, раённая газета і радыё, вучні ДУА "Сярэдняя школа № 4 г. Нясвіжа" Карына Язэпчык, Паліна Літвінская, Ангеліна Жукоўская, Уладзіслаў Загуста і Аляксандра Дзяйко.

Падчас паэтычнай гадзіны "Паэзія — жывая сіла" сябры раённага літаратурна-музычнага аб'яднання "Валошкі" і наведвальнікі клуба "Залаты ўзрост" ДУ "Нясвіжскі РТЦСАН" мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, сябра Беларускага саюза музычных дзеячаў, сябра Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Ірыны Аляксандраўны Карнаухавай. Ірына Аляксандраўна пазнаёміла са сваімі творамі, змешчанымі ў яе апошніх паэтычных зборніках. Асабліва спынілася на паэтычным дыску «Жизни кружева».

Сябры раённага літаратурна-музычнага аб'яднання «Валошкі» Дзмітрый Лібар, Алена Шаблоўская і Уладзімір Жылко таксама прачыталі свае вершы. Ірына Аляксандраўна выказала свае меркаванні аб творчасці нясвіжскіх паэтаў. Упершыню на пасяджэнні аб'яднання прагучалі вершы Марыны Суднік. Ірына Аляксандраўна запрасіла паэтку стаць наведвальніцай абласнога народнага клуба кампазітараў і паэтаў «Жывіца».

У гэты дзень прайшоў таксама традыцыйны конкурс юных чытальнікаў "Чытаем Паўлюка Пранузу". Конкурс праходзіў па трох узроставых катэгорыях, у якіх удзельнічалі

дзеці ад 7 да 15 гадоў школ горада і раёна, якія дэкламавалі на памяць любімы вершаваны твор паэта на беларускай мове. Удзельнікі пранікнёна чыталі вершы, імкнуліся перадаць унутраныя перажыванні і пачуцці, якія заклаў у свае вершы Паўлюк Прануза. Эмацыянальнае чытанне верша “Маці” Дзіянай Селіванавай знайшло водгук у сэрцах слухачоў, выклікала нават слёзы ў некаторых з іх. Заваявала сэрцы членаў журы і прысутных самая юная ўдзельніца Сафія Усава. Вядома, усе юныя артысты хваляваліся, усе стараліся, у кожнага былі свае адметнасці, аднак умова конкурсу вымагала вызначыць пераможцаў.

Аўтарытэтнае журы, якое ўзначаліў Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі, беларускі пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, грамадскі дзеяч, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка", кіраўнік Беларускага дзіцячага фонду, а таксама ў складзе Зоі Мікалаеўны Кулік, сябра Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў, вядучай міжнароднага радыё "Акіян +", і Кацярыны Віктараўны Дубовік, старшыні райкама прафсаюзаў работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, ацэньвалі выбар твора выступаючымі, глыбіню іх пранікнення ў вобраз і сэнс, а таксама артыстызм выканання.

Па выніках конкурсу вызначаны пераможцы: Сафія Усава, Марыя Казленя, Лізавета Мелехіна, Ксенія Плакса і Дзіяна Селіванава. Журы таксама адзначыла выступленне Валерыі Прахода. Дзяўчынкі ўзнагароджаны дыпломамі, памятнымі падарункамі, а таксама кнігамі У. С. Ліпскага з аўтографам і асабістымі пажаданнямі кожнаму пераможцу. Усе ўдзельнікі атрымалі граматы за ўдзел і салодкі прыз.

Вучні 4"Б" класа ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Нясвіжа" сустрэліся з Уладзімірам Ліпскім, які завітаў на сустрэчу «Лепшых кніг адкрыты нам старонкі» разам з аўтарам Анастасіяй Радзікевіч.

Уладзімір Сцяпанавіч імкнецца сваёй творчасцю і грамадскай дзейнасцю сцвярджаць дабро, вучыць любіць сваю

Радзіму і кожнага чалавека ў ёй, адчуваць радасць ад жыцця і літаратуры. Падчас сустрэчы Уладзімір Сцяпанавіч прэзентаваў выданні "Я тут жыву" і "Мая Беларусь", прачытаў урыўкі з твораў і дзеці атрымалі сапраўдны ўрок беларускай літаратуры ад таленавітага пісьменніка. Падзяліўся ён сваімі разважаннямі аб прыгажосці беларускай мовы, літаратуры, успамінамі аб сваёй сям’і і творчымі планамі.

Анастасія Віктараўна на суд юных чытачоў прадставіла сваю кнігу "Скарбы Нясвіжскага замка".

У межах Фестывалю адбылася і творчая сустрэча з Дзмітрыем Кашаварам, аўтарам кнігі “99 знаменитых мест Беларуси”. Гэта добра ілюстраваная кніга прысвечана Беларусі — краіне з багатай гісторыяй, самабытнай культурай і запаведнай прыродай. Яна знаёміць з 99 знакамітымі гісторыка-культурнымі, прыроднымі і ландшафтнымі аб'ектамі.

Аўтар кнігі заклікае падарожнічаць па Беларусі, каб абудзіць пачуццё гонару за сваю малую радзіму, жаданне пабываць у яе вядомых і малавядомых кутках, дакрануцца да культурных вытокаў душы беларуса. Падчас свайго выступлення Дзмітрый Кашавар выкарыстоўваў відэаролікі, прапанаваў прысутным прыняць удзел у пазнавальнай віктарыне “Па знакамітых месцах Беларусі”. Той, хто набраў найбольшую колькаць балаў, атрымаў у падарунак ад пісьменніка яго кнігу.

Цікавы аповед, эмацыянальнае чытанне, любоў да прыгожай беларускай мовы, удалы гумар гасцей аказаў пазітыўнае ўражанне на слухачоў. Творчыя сустрэчы пераўтварыліся ў сапраўднае свята, на якім былі добры настрой, вясёлы смех і карысная размова з таленавітымі пісьменнікамі. І дарослыя, і дзеці атрымалі задавальненне ад сустрэч, якія запомняцца надоўга.

На працягу красавіка ў фае бібліятэкі дзейнічала ілюстрацыйна-дакументальная выстава “Голасам свайго

пакалення”. Тут можна было ўбачыць экспанаты, якія сам Прануза і яго дачка Алена Паўлаўна Лявіцкая падаравалі бібліятэцы. Гэта рукапісы вершаў, кнігі з бібліятэкі Паўла Кузьміча з аўтографамі паэтаў, з якімі ён сябраваў, асабістыя рэчы. Многія кнігі падпісаны аўтарам.

Пры жыцці Прануза цесна супрацоўнічаў з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, у фонд якога перадаў частку сваіх рукапісаў, фотаздымкаў, кніг. Яшчэ частку пасля яго смерці дачка перадала ў Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей. Афармляючы да Фестывалю кніжную экспазіцыю, частка экспанатаў бярэцца з гэтых музеяў. Сёлета дзяржаўная ўстанова “Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей” выдала на часовае захоўванне некаторыя музейныя экспанаты: ганаровыя граматы паэта, членскія білеты, фотаздымкі, рэчы П. Пранузы.

Для наведвальнікаў былі арганізаваны гутаркі ля выставы “Паўлюк Прануза. Аўтограф у гісторыі”, падчас якіх бібліятэкары знаёмілі са складаным жыццёвым лёсам і багатай творчай спадчынай паэта-земляка.

У гэты дзень узгадвалі жыццё Паэта — жыццё, якое стала сапраўдным сімвалам свайго пакалення. Ён вытрымаў экзамен на мужнасць, адвагу і любоў да Радзімы. Навучыўся берагчы кожны дзень, умеў даражыць сяброўствам, быў чуйным да падзей і да людзей. Ён быў, ёсць і застанецца ў гісторыі беларускай літаратуры, у памяці сваіх вучняў, у сэрцах родных, блізкіх і тых, хто яго ведаў. Чалавек, які каваў перамогу для нашай светлай будучыні, Чалавек з вялікай літары, імя якога — Павел Кузьміч Прануза.

З мэтай злучыць месцы горада ў адзіную гістарычную прастору, звязаную з біяграфіяй беларускага паэта і перакладчыка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, Ганаровага грамадзяніна горада Нясвіжа Паўла Кузьміча Пранузы, Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка распрацавала медыяпадарожжа “Пранузаўскі Нясвіж”. На карце горада адзначаны тыя месцы,

якія ён часта наведваў, якія любіў. Больш дэталёва кожны можа пазнаёміцца з гэтай работай на афіцыйным сайце бібліятэкі. Будзем рады, калі гэтае віртуальнае падарожжа зацікавіць карыстальнікаў і стане карысным. Акрамя таго, на сайце ўзгаданы Фестывалі паэзіі імя Паўла Пранузы "Голасам свайго пакалення", якія праходзілі ў мінулыя гады.

Амаль 90 гадоў адвёў лёс Паўлюку Пранузе. Крочыў ён смела, яго нішто не прымусіла стаць іншым. У свой апошні, 85-гадовы юбілей, даючы інтэрв'ю адной з беларускіх газет, Павел Кузьміч усім параіў:

*"Трэба вучыцца валодаць сабой. Цяжкасцяў не трэба баяцца. Яны былі заўсёды: і да вайны, і ў першыя пасляваенныя гады, і пазней – паверце ўжо мне. Самае галоўнае – духоўна жыць, быць сур'ёзным, добразычлівым, працавітым чалавекам. І тады будзе лепш праглядвацца заўтрашні дзень".*

Што ж… Будзем вучыцца, паважаны Павел Кузьміч!

*Рыжыкава А.У.,*
*загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі*
*Нясвіжскай цэнтральнай раённай*
*бібліятэкі імя Паўлюка Пранузы*

### *"Беларусам я завуся, родным краем ганаруся"*

Беларусь мая, ты адзіная,
Перад кім на каленях стаю:
Мне, слузе твайму, цяжка загінуць,
Лёгка – жыць у славу тваю.
*Уладзімір Караткевіч*

17 лютага адбылося пасяджэнне краязнаўчага клуба "Крыніца", які дзейнічае пры Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэцы. Мерапрыемства ладзілася ў ДУА

“Сярэдняя школа №2 г. Старыя Дарогі” ў фармаце інтэлектуальнай гульні-віктарыны.

Тое, што гульня пачалася са слоў прызнання ў любові да сваёй Бацькаўшчыны, са слоў падзякі роднай зямлі, абумоўлена яе тэмай. Беларусь… Бацькаўшчына… Адзіны, дарагі куточак зямлі, дзе мы нарадзіліся і выраслі, адкуль зрабілі першыя крокі ў дарослае, свядомае жыццё. Гэта край блакітных азёраў і шумлівых гаёў, зычлівых і сціплых, працавітых і мудрых людзей, край партызанскай славы, мужнасці і гераізму. Гэта зямля, дзе свята захоўваецца памяць аб гераічных і трагічных старонках гісторыі.

Больш за 75 гадоў мінула з таго часу, як над фашысцкім рэйхстагам узвіўся сцяг Перамогі, як сціхлі гарматы Вялікай Айчыннай вайны. За гэты час вырасла не адно пакаленне людзей, якія аднавілі разбураную вайной гаспадарку, паднялі з руінаў гарады і вёскі, дабіліся прызнання Рэспублікі Беларусь як суверэннай, незалежнай дзяржавы.

Разумнікам і разумніцам гульні-віктарыны патрэбна было прадэманстраваць свае веды па гісторыі Беларусі, успомніць аб яе слаўных старонках, аб гарадах і населеных пунктах, этнаграфічнай і культурнай спадчыне нашага краю, а, галоўнае, — аб людзях, якія праславілі Радзіму самаадданай працай, плёнам сваіх талентаў і здольнасцяў, дзёрзкасцю розуму.

Усе мы адрозніваемся адзін ад аднаго па полу, па ўзросту, па характары, але ўсіх нас аб’ядноўвае самае галоўнае — мы жывём у Беларусі. Беларуская зямля — наша карміцелька, а таму ўсе мы павінны ведаць і гісторыю краіны, і беларускую мову, валоданне якою з’яўляецца важнейшым паказчыкам нацыянальнай самасвядомасці.

Перад пачаткам гульні, каб высветліць, наколькі вучні ведаюць родную мову, тром жадаючым былі прапанаваны аркушы з заданнем па перакладу слоў з рускай мовы на беларускую. Усе добра і выдатна справіліся з яго выкананнем.

Першы раўнд “А ці ведаеце вы…?” датычыўся гісторыі Беларусі. Наступны тур “Славутыя імены Беларусі” быў прысвечаны тым беларусам, якія праславілі ў свеце нашу Радзіму. Па вершаваных радках альбо фотаздымках патрэбна было даведацца, аб кім ідзе размова. Наступны раўнд быў прысвечаны архітэктурнай спадчыне Міншчыны. Удзельнікі ахвотна згадвалі Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Беларускі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, помнікі Анастасіі Слуцкай і Максіму Багдановічу, Чырвоны касцёл і іншыя архітэктурыя збудаванні.

Наша спадчына — гэта і этнаграфія, і традыцыі, і абрады продкаў. Наступны тур гульні быў звязаны з прадметамі штодзённага ўжытку беларусаў. Ён называўся “Пазнай прадмет па фотаздымку і апісанні”. Гэты конкурс стаў самым цікавым і пазітыўным, падчас якога ва ўсіх быў добры настрой і шмат эмоцый. Апошні тур гульні быў прысвечаны цудам Старадарожскай зямлі. Удзельнікі згадалі святыя мясціны нашага раёна, а потым усе з задавальненнем паглядзелі відэаролік “Цуды Старадарожчыны” і праспявалі разам песню пра наш горад Старыя Дарогі. На працягу сустрэчы вучні чыталі вершы пра Беларусь, пра наш Старадарожскі край. Усе ўдзельнікі мерапрыемства атрымалі памятныя прызы, а чытальнікі яшчэ і значкі з выявай Францыска Скарыны. Сустрэча дала магчымасць яшчэ раз адчуць і зразумець, што мы жывём у цудоўнай і непаўторнай, багатай на гістарычныя падзеі краіне. І дзе б мы не апынуліся, куды б не закінуў нас лёс, у нашым сэрцы заўсёды будзе адчуванне моцнай повязі з родным краем, з зямлёй нашых бацькоў. Пакуль мы шануем сваіх продкаў, не забываемся на свае карані, паважем Радзіму, мы існуем як народ, як нацыя. Як заклік прагучалі словы вядучага: “Любіце свой край! Кожны дзень адкрывайце для сябе непаўторную прыгажосць роднай зямлі. Прыслухоўвайцеся да нашай пявучай мовы. Заўважайце

дабрыню, адкрытасць, таленавітасць нашага народа. І вы адчуеце ў душы вялікі гонар за сваю Радзіму".

Выкарыстанне ў зносінах з вучнямі краязнаўчага матэрыялу дазваляе выхоўваць у падлеткаў павагу да Бацькаўшчыны, малой Радзімы, яе мінулага, культурных каштоўнасцей і землякоў, а таксама фарміраваць веды пра побыт, заняткі, гаспадарчае жыццё і абрады продкаў. Сувязь моладзі з матэрыяльнай і духоўнай спадчынай дапамагае ёй не толькі ацаніць мінулае і сённяшняе, але і пазнаць сябе ў жыцці, вызначыцца ў будучыні.

*Дарошка С. Л.,*
*бібліятэкар аддзела*
*абслугоўвання і інфармацыі*
*ДУК "Старадарожская раённая*
*цэнтральная бібліятэка"*

**Бібліятэчны веснік: інфармацыйны зборнік**

**Вып. 1**

Складальнік: Лазарава І.П.

Падпісана да друку 23.11.2021

Тыраж 3 экз. Заказ № 6

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”